**Быстрова К.С.,** выпускнік
Навуковы кіраўнік: Саітава В.І.

# ІНАВАЦЫЙНЫ КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНЫ ПРАЕКТ «1000-ГОДДЗЕ БРЭСТА: ПРАЗ ПРЫЗМУ СТАРАДАЎНІХ ДАКУМЕНТАЎ»

На сённяшні дзень у грамадстве асэнсавана неабходнасць вывучэння гісторыі і культуры краіны, развіцця пачуцця патрыятызму, гонару за сваю нацыю. У сувязі з гэтым у дзейнасці ўстаноў культуры, у тым ліку і бібліятэк, атрымал развіццё такі накірунак як краязнаўства. Важным інструментам папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны становіцца вывучэнне гістарычных дакументаў як носьбітаў краязнаўчай інфармацыі.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі (НББ) заўсёды займала важнае месца ў сістэме ўстаноў дакументных камунікацый. Важным накірункам дзейнасці НББ з'яўляецца фарміраванне разнастайных бібліяграфічных і поўнатэкставых электронных інфармацыйных рэсурсаў. Развіццё сучасных інфармацыйных тэхналогій, шырокамаштабны перавод традыцыйнай друкаванай дакументнай прадукцыі у лічбавую форму дазваляюць ствараць «якасна новыя рэсурсы, у якіх комплексна спалучаюцца самыя розныя віды інфармацыі, а карыстальнікам прадстаўляецца адзіная кропка доступу як да саміх першакрыніц, так і да вынікаў іх аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкі і навуковага вывучэння [1, с. 61]». Падобны рэсурс ствараўся НББ на працягу 2010–2014 гг. у рамках навукова-даследчага і выдавецкага праекта, прысвечанага памятным кніжкам беларускіх губерній [2].

У 2015 годзе НББ прыступіла да рэалізацыі прыкладной навукова-даследчай работы (ПНДР) «Віртуальная рэканструкцыя дакументаў і матэрыялаў па рэгіянальнай гісторыі Беларусі» (2015–2018 гг.) Мэта ПНДР – даследаваць дакументы і матэрыялы па асобным аб'ектам рэгіянальнай гісторыі Беларусі і забяспечыць лічбавае ўзнаўленне як аўтэнтычных крыніц, так і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вынікаў іх навуковага асмыслення, структураваць інфармацыйныя масівы і прадставіць іх у адзіным комплексе.

На працягу 2015–2017 гг. у рамках гэтай ПНДР рэалізаваны наступныя праекты: «100 год з гісторыі Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі: дакументы і матэрыялы 1840–1940 гг.: да 175-годдзя з дня адкрыцця», «Региональная история Беларуси в документах и материалах Виленской археографической комиссии, 1864–1915» і «Документы и материалы о деятельности Витебской архивной комиссии, 1909–1919». Вынікам праведзенай работы з‘явілася стварэнне электронных выданняў, якія ўтрымліваюць бібліяграфічную, фактаграфічную, у тым ліку біяграфічную інфармацыю; лічбавыя копіі разнастайных дакументаў і матэрыялаў.

У 2018 годзе у структуры навукова-даследчага аддзела бібліяграфіі НББ сфарміраваны сектар краязнаўства і праектнай работы, які працягне працу па вывучэнні рэгіянальнай гісторыі Беларусі. На бягучы год у рамках вышэйназванай ПНДР запланавана ралізацыя інавацыйнага культурна-гістарычнага праекта «1000-годдзе Брэста: праз прызму старадаўніх дакументаў».

Брэст – адзін з самых старажытных населеных пунктаў Беларусі, які займае пачэснае месца сярод іншых беларускіх гарадоў з адметным гістарычным мінулым. У 2019 г. будзе адзначацца знакавая дата – 1000 год з часу першага пісьмовага ўпамінання Брэста ў «Аповесці мінулых гадоў», ад якой пачынаецца адлік гісторыі горада. Гісторыя Брэста надзвычай насычаная, складаная, багатая на падзеі і імёны, авеяная легендарнай славай. Гораду прысвечана вялікая колькасць выданняў і публікацый, ён згадваецца ў шматлікіх летапісах, мемуарах, архіўных дакументах, літаратурных, мастацкіх творах і ў іншых крыніцах. Выпуск юбілейнага электроннага выдання, у якім у адзіным комплексе будуць адлюстраваны як самі першакрыніцы па гісторыі Брэста ў выглядзе лічбавых копій, так і разнастайныя суправаджальныя матэрыялы (навуковыя, бібліяграфічныя, фактаграфічныя, даведачныя,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ілюстрацыйныя), будзе спрыяць папулярызацыі горада, яго багатай гістарычнай і культурнай спадчыны.

Такім чынам, мэта праекта – стварыць мультымедыйныя рэсурсы (DVD-дыск і віртуальны анлайнавы праект) з адлюстраваннем аўтэнтычных старажытных дакументаў і навуковых, навукова-папулярных, літаратурных, публіцыстычных і іншых матэрыялаў, прысвечаных гораду Брэсту, на аснове пошуку, збору і даследавання адпаведнай крыніцазнаўчай базы, а таксама яе алічбоўкі, навуковага асэнсавання і бібліяграфічнага аснашчэння.

У ходзе рэалізацыі праекта неабходна вырашыць наступныя задачы:

- сабраць з максімальнай паўнатой гістарычныя дакументы і публікацыі па тэме праекта;
- стварыць або сабраць іх лічбавыя аналагі;
- выявіць ці стварыць суправаджальныя матэрыялы (навукова-даследчыя, фактаграфічныя, біяграфічныя, бібліяграфічныя, аўдыявізуальныя і інш.);
- структурыраваць сфарміраваныя інфармацыйныя масівы і прадставіць іх у адзіным комплексе;
- ажыццявіць выданне і распаўсюджванне кампакт-дыскаў;
- стварыць анлайную версію рэсурса, размясціць на партале НББ і сайце Брэсцкай абласной бібліятэкі;
- правесці мерапрыемствы па папулярызацыі дасягнутых вынікаў работы над праектам.

Храналагічны ахоп матэрыялаў: ад першага ўпамінання Брэста да сярэдзіны XX ст.

Супрацоўнікі НДА бібліяграфіі праводзяць пошукавую работу па выяўленні дакументаў па гісторыі і культуры Брэстчыны з фондаў НББ. Адбору падлягаюцца розныя віды дакументаў : кнігі, артыкулы, паштоўкі, карты і інш. Усе выяўленыя дакументы будуць алічбаваны і размешчаны па адпаведным раздзелам, такім як»Юрыдычныя дакументы», «Краязнаўчыя матэрыялы XIX

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ст.» і інш. Структура выдання будзе канчаткова ўдакладняцца у ходзе выканання праекта.

Адной з асноўных крыніц выяўлення інфармацыі аб паўсядзённым жыцці горада і найбольш важных грамадскіх падзеях з‘яўляюцца перыядычныя выданні. Таму мэтазодна вылучыць у структуры выдання асобны раздзел – «Брэст на старонках перыядычнага друку». Гэты раздзел будзе змяшчаць электронныя копіі артыкулаў з разнастайных часопісаў, газет, штогоднікаў. Крыніцамі выяўлення перыядычных выданняў з‘яўляюцца электронны каталог НББ, поўнатэкставыя калекцыі «Перыядычны друк Беларусі 2-ой паловы XVIII ст. – 1917 г.», »Перыядычныя выданні Заходняй Беларусі (1921–1939)», бібліяграфічныя паказальнікі «Газеты Беларусі, 1776–1975», «Летапіс часопісных артыкулаў, 1928–1933», «Беларускі перыядычны друк : 1917–1927». Пытанне адбору гэтых выданняў патрабавала выпрацоўкі дакладных крытэрыяў: асноўнымі вызначаны месца выдання, змест, гады выпуску. У склад крыніц, якія падлягаюць прагляду, уключаны перыядычныя выданні Гродзенскай губерні (да тэрыторыі якой ў часы Расійскай імперыі адносіўся Брэст), Вільні, Польшчы, Расійскай імперыі. Змястоўна перыядычныя і прадаўжальныя выданні маюць пераважна гуманітарны, рэлігійны і літаратурна-мастацкі характар. Кожны нумар перыядычнага выдання праглядваецца de visu на наяўнасць артыкулаў, прысвечаных Брэсту. Да некаторых выданняў складзены навукова-дапаможны апарат, што палягчае пошук. Так, да часопіса «Ateneum Wilenski» за 1924 год складзены «Indeks autorow, osob i miescowości». На кожны артыкул складаецца бібліяграфічнае апісанне.

Трэба адзначыць, што многія перыядычныя выданнізахоўваюцца ў НББ у няпоўным камплекце, сустракаюцца і дэфектныя экзэмпляры. Каб дасягнуць найбольшай паўнаты адлюстравання матэрыялаў, акрамя фондаў НББ трэба задзейнічаць і рэсурсы іншых удзельнікаў праекта. Партнёрамі НББ з‘яўляюцца Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага, Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна, кафедра крыніцазнаўства гістарычнага факультэта

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі.

Магчыма спадзявацца, што інфармацыйны рэсурс, які рыхтуецца ў Год малой радзімы ў Беларусі, для жыхароў Брэсцкага рэгіёна і яго даследчыкаў стане важнай крыніцай пазнання гісторыі і культуры і новых адкрыццяў.

1. Градоўкіна, І.У. Праект «Віртуальная рэканструкцыя дакументаў і матэрыялаў па рэгіянальнай гісторыі Беларусі» ў кантэксце стварэння крыніцазнаўчай базы па гісторыі айчыннай навукі і адукацыі / Градоўкіна І.У. // Материалы IV Международного конгресса ―Библиотека как феномен культуры". Информационные ресурсы библиотек в образовательной, научной и социокультурной среде, Минск, 4–6 октября 2016 г. / [сост. А.А. Суша ; науч. ред. Р.С. Мотульский]. – Минск, 2016. – С. 60–67.

2. Грядовкина, И. Мультимедийный проект «Памятные книжки Гродненской губернии» в помощь изучению истории Гродно и региона / Ирина Грядовкина // Бібліятэчны свет. – 2014. – № 2. – С. 19–21.

**Вайцяхоўская А.Д.** студэнт
Навуковы кіраўнік – Гулак А. А.

## АКТУАЛІЗАЦЫЯ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА АРНАМЕНТА Ў СУЧАСНАЙ КУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ

Значэнне, віды і мастацкая вобразнасць беларускага арнамента, яго ўжыванне ў народным тэкстылі і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве сёння грунтоўна даследаваны ў навуцы. Назавем толькі асноўныя працы ў гэтым кірунку: В.Я. Фадзеева «Беларуская народная вышыўка» (1991), М.П. Жабінская «Складзі ўзор сам» (1992), М.С. Кацар «Беларускі арнамент: Ткацтва. Вышыўка» (1996), Я.М. Сахута «Народнае мастацтва Беларусі» (1997),

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ